УДК 821.161.3’04.09 (092)Скорина Ф.

ПРАДМОВЫ ДА БІБЛІІ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ: ЗМЕСТ, СТРУКТУРА, СТЫЛІСТЫКА

А.М. Муравіцкая
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
пр-т Незалежнасці 4, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь
almurav@yandex.by

Аннотация. В статье рассматриваются предисловия к Библии, которые составляют основу литературно-публицистического наследия Франциска Скорины. Основное внимание уделяется содержанию, структуре и стилистике данных произведений.

***Ключевые слова*:** Франциск Скорина; Библия; предисловия; сказания; Старый Завет; Новый Завет.

FOREWORD TO THE BIBLE BY FRANCYSK SKARYNA: CONTENT, STRUCTURE, STYLISM

E.M. Muravitskaya
Belarusian State University
Independence Avenue 4, 220004, Minsk, Republic of Belarus

Annotation. The article examines the prefaces to the Bible, which form the basis of the literary and journalistic heritage of Francysk Skaryna. The main attention is paid to the content, structure and style of these works.

Keywords: Francysk Skaryna; Bible; prefaces; legends; Old Testament; New Testament.

Кожнай кнізе Свяшчэннага Пісання ў Францыска Скарыны папярэднічае прадмова або сказанне. Ва ўсходнеславянскім рэгіёне прадмовы ўпершыню ўзніклі ў сярэдневяковай рукапіснай літаратуры 10 – 12 ст., аднак шырокае распаўсюджанне атрымалі толькі ў эпоху Адраджэння ў сувязі з развіццём кнігадрукавання і ростам аўтарскага самаўсведамлення. Ф.Скарына, творча выкарыстаўшы традыцыі айчыннай (старажытнарускай і старабеларускай), заходнеславянскай (чэшскай і польскай) і заходнееўрапейскай літаратур, увёў прадмову ў шырокі ўжытак, надаўшы ёй філасофска-асветніцкі, навучальна-пазнаваўчы і маральна-эстэтычны змест. Ён адмовіўся ад ананімных або стандартна-этыкетных прадмоў сваіх папярэднікаў, усебакова выявіў у гэтым жанры сваю творчую асобу як пісьменніка, перакладчыка, вучонага і выдаўца.

Пяцьдзесят прадмоў складаюць аснову літаратурна-публіцыстычнай спадчыны Ф.Скарыны, у якой адлюстраваліся яго арыгінальныя грамадска-палітычныя, філасофскія, прававыя, эстэтычныя, мовазнаўчыя і педагагічныя погляды. Дваццаць адна з іх мае назву “предословие” (радзей “предсловие”, “предъсловие”), дваццаць пяць – “сказание” (пераважна да новазапаветных кніг), дзве назвы па-беларуску прадмовамі (“предумолва” да Кнігі Ісуса Навіна і “предмова” да “Апостала”) і не маюць жанравай адзнакі (да “Пасхаліі” і “Малой падарожнай кніжкі”).

Хоць усе яны адпавядаюць паняццю прадмовы, аднак уведзеная Ф.Скарынам дыферэнцыяцыя адлюстроўвае пэўныя асаблівасці зместу, структуры і стылістыкі яго твораў. “Предословия”, як правіла, маюць тэарэтычна-канцэптуальны характар, большыя памерам і больш падрабязныя. Яны складаюцца з некалькіх частак: абагульняльнай ідэі філасофскага, асветніцкага, маральна-дыдактычнага ці тэалагічнага характару (“Всяко писание Богом водъхненое полезно есть ко учению и ко обличению, исправлению, и ко наказанію правды”); агульнай характарыстыкі зместу, структуры і гісторыі стварэння кнігі,спецыфікі, яе аўтараў і асноўных герояў (“Псалтырь же сама едина вси тые речи в собе замыкает…”; “Книгу сию, рекомую Премудрость, написал есть Филон Философ…”; “Исус Навин был ест воевода людей Ізраилевых…”); шматлікіх гістарычных, філалагічных , юрыдычных і тэалагічных каментарыяў да адпаведнай кнігі , тлумачэнняў этымалогіі іх назваў (“А зовется Псалтирь гудба, едина подобна к гуслям”, “Третии же книги царя Саломоновы нарицаються Сира сирам, по-латине – Кантикум кантыкорум, еже по-рускы и исказуется Песнь песням); падрабязнай анатацыі, асабліва да кніг апавядальна-гістарычнага ці сюжэтна-фабульнага зместу (“Книги первые Моисеевы, суть Бытья. В них же пишет о сотворении света, о зачале людского поколения, о розделении языков и земли, и о роде еврейском…”); тлумачэння прынцыпаў перакладу і выдання (“Теже розделил есми вси псалмы на стихи по тому, якося выных языцех делить”). У некаторых прадмовах Скарына вызначае яшчэ кола чытачоў, для якіх прызначаецца кніга (“И всякому человеку потребна чести, понеже ест зерцало жития нашего…»), яе грамадска-выхаваўчыя і эстэтычныя функцыі (“Псалом жестокое сердце мягчить…, вкупе тело пением веселить а душу учить”), аб’яўляе сваё аўтарства, навуковую кампетэнтнасць і асноўную мэту пісьменніка, выдаўца і асветніка (“Прото ж и я, Францишек Скоринин сын с Полоцка, в лекарских науках доктор, знаючи сее, иже есть наивышшая мудрость розмышления смерти, и познание самого себе…, казал есми тиснути книгу святого Іова рускым языком Богу ко чти и людем посполитым к научению”) [1, с. 422].

У сваіх прадмовах і сказаннях Скарына не толькі сцісла выкладае змест той ці іншай кнігі Свяшчэннага Пісання, але і дае тлумачэнні, высвятляючы змест кожнай кнігі Бібліі дзеля “выратавання душы” і дзеля зямных патрэбаў чалавека. Тут ён тлумачыць асобныя біблейскія падзеі і паказвае, наколькі тая ці іншая з іх важная для душэўнага ці цялеснага жыцця чалавека. Чытаючы скарынаўскія прадмовы і сказанні, можна пераканацца, што ў іх выяўлена душа самога тлумачальніка. Акрамя таго, прадмовы і сказанні выяўляюць дух і патрэбы часу той эпохі, у якой жыў і працаваў Скарына, а таксама вельмі дакладна адлюстроўваюць думкі і скіраванасць самога аўтара, яго спадзяванні і памкненні, яго светапогляд, яго маральнае і духоўнае аблічча, яго палымянае жаданне дапамагчы свайму народу ў цяжкі час, у якім ён жыў.

Многія думкі Скарыны, выкладзеныя ў яго прадмовах і сказаннях, значна апярэдзілі эпоху, у якой ён жыў. Яны не толькі не страцілі значэння ў наш час, але і набылі новае гучанне, адпаведнае з нашай эпохай. Тое, пра што марыў Скарына ў сферы ўзаемадзеяння людзей паміж сабою, па волі Божай, можа стаць нормай маральнага жыцця не толькі хрысціян, але і многіх людзей на зямлі, якія не маюць да хрысціянства непасрэдных адносін. І гэта паказвае сілу Божых законаў і ісцін, закладзеных у Свяшчэнным Пісанні. Гэта дакладна зразумеў і адчуў вялікі асветнік, таму так імкнуўся данесці да сэрцаў сваіх чытачоў [2, с. 3–5].

Францыск Скарына лічыць Біблію асноўнай крыніцай для ўсіх навук і ў прадмове да ўсёй Бібліі адзначае: “Хочаш ведаць граматыку, ці, па-руску кажучы, грамату, якая вучыць правільна чытаць і гаварыць, – знойдзеш усё ў поўнай Бібліі, асабліва ў Псалтыры, чытай іх. Калі жадаеш засвоіць логіку, якая вучыць доказна адрозніваць праўду ад крыўды, – чытай кнігу святога Іава або Пасланні святога апостала Паўла. Задумаеш авалодаць рыторыкай, ці красамоўствам, – чытай кнігі Саламонавы. Гэта – тры навукі славесныя. Калі захочаш навучыцца музыцы ці спевам, – вялікае мноства вершаў і песняў святых ва ўсёй гэтай кнізе знойдзеш. Захочаш ведаць арыфметыку, якая вучыць хутка і без памылак лічыць, – чацвёртую кнігу Маісееву часта чытай. Зноў жа, калі маеш перад вачыма навуку геаметрыю, якая па-нашаму называецца землямеранне, – чытай кнігі Іісуса Навіна. Што да астраноміі або зорказнаўства – знойдзеш у пачатку гэтай кнігі пра стварэнне сонца, месяца і зорак; … Калі ж маеш любоў да ваенных і гераічных спраў – чытай кнігі Суддзяў ці кнігі Макавеяў… Калі захочаш коратка прасачыць гісторыю за многа тысяч гадоў, – чытай кнігі Параліпаменана. Там, пачынаючы ад Адама і да Седэкіі, апошняга цара іўдзейскага, апісаны ўсе роды. А калі захочаш спасцігнуць мудрасць добрых нораваў – перачытвай кнігі Іісуса Сірахава і Прытчы Саламонавы” [2, с. 11-- 12]. У сваёй прадмове да ўсёй Бібліі Скарына

гаворыць пра яе склад, пералічвае кнігі, якія ўваходзяць у Біблію, і вельмі коратка акрэслівае іх змест. З усіх біблейскіх кніг Скарына асабліва вылучае Евангелле і заклікае пастаянна чытаць яго.

“Сказанні” Францыска Скарыны паводле зместу і структуры – кароткія прадмовы, абмежаваныя анатацыяй да кнігі і лаканічнымі тлумачэннямі навукова-інфармацыйнага характару (“Остров преславный Критъский, иже ест в мори Посредоземном; имея в собе градов сто”). Дзве “предмовы” Скарыны адрозніваюцца ад “предъсловий” яшчэ большай самастойнасцю адносна біблейскай традыцыі і шырынёй светапогляду. Тут асаблівую цікавасць Ф.Скарына выказаў да Кнігі Іісуса Сірахава, дзе гаворыцца пра цара Пталамея Філадэльфа, які быў прыхільнікам навукі і мудрасці, які “болей избрал оставити в науце и в книгах вечную славу и паметь свою, нежели во тленных великих царскых сокровищах”. На яго думку, тут у афарыстычнай форме раскрыта не толькі Божая (“Саламонава”), але і свецкая (“Арыстоцелева”) мудрасць.

Сінкрэтызм зместу прадмоў, наяўнасць у іх элементаў літаратуры, тэалогіі, публіцыстыкі, гісторыі, правазнаўства, лінгвістыкі, эстэтыкі і літаратурнай крытыкі абумовілі шматпланавую, хоць і адносна цэласную стылістыку. Па сваёй літаратурнай форме скарынаўскія прадмовы сталі класічнымі ўзорамі ў гэтым жанры беларускай літаратуры. Пісьменнік вядзе з чытачом праніклівую, даверліва-шчырую і разам з тым узнёслую, урачыстую гаворку пра значныя духоўныя каштоўнасці ўсяго чалавецтва і кожнага народа паасобку. У іх спалучаецца глыбіня думкі з афарыстычнасцю і мудрай прастатой выкладання вопытнага настаўніка [1, с. 423].

Асобныя месцы яго твораў (пра патрыятызм, любоў да радзімы і роднай мовы) гучаць як красамоўныя вершы. Вось толькі адзін, але, відаць, самы вядомы фрагмент з яго прадмовы да Кнігі Юдзіф: “Таму што ад нараджэння звяры, што жывуць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лятаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы ды ім падобныя бароняць вуллі свае, -- так і людзі: дзе нарадзіліся і ўзгадаваны былі ў законе Божым, да таго месца вялікую ласку маюць” [2, с. 74]. Гэта сапраўды прыгожыя і паэтычныя словы, якія сведчаць пра тое, што любоў да сваёй краіны і свайго народа Скарына лічыў натуральным, ад прыроды ўласцівым кожнаму чалавеку пачуццём.

Скарынаўскія прадмовы паслужылі ўзорам для многіх пісьменнікаў і выдаўцоў, якія працягвалі яго думкі пра значэнне кнігі для духоўнага развіцця народа. На ўсходнеславянскіх землях яго справу працягвалі В.Цяпінскі, С.Будны, Л.Зізаній, М.Сматрыцкі, Сімяон Полацкі і інш. Імя Францыска Скарыны стаіць у радзе славутых гістарычных імён сусветнага значэння і з’яўляецца нацыянальнай гордацю беларусаў. Таму нам, яго

нашчадкам, патрэбна як мага часцей звяртацца да яго творчасці, да яго духоўных запаветаў.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Францыск Скарына: энцыклапедыя / рэдкал.: У.У.Андрыевіч (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – 568 с.

2. Францыск Скарына. Прадмовы і пасляслоўі да кніг Бібліі / Адаптацыя на сучасную беларускую мову Л.Я.Кулажанка, Т.А.Матрунчык. – Мінск, Беласток: Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора ў г. Мінску, 2018. – 184 с.

3. Францыск Скарына. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.